# УРОК БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

**Урок** беларускай мовы – гэта асноўная арганізацыйна-педагагічная форма, якая сістэматычна выкарыстоўваецца для навучання беларускай мове, развіцця і выхавання вучняў сродкамі прадмета ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.

Урокі беларускай мовы адрозніваюцца па дыдактычных мэтах, змесце і структуры. У залежнасці ад дыдактычнай мэты і этапаў засваення вучэбнага матэрыялу выдзяляюцца наступныя традыцыйныя тыпы ўрокаў: тлумачэння новага матэрыялу (увядзення новых ведаў); замацавання ведаў, удасканалення ўменняў і навыкаў; паўтарэння і сістэматызацыі вывучанага; камбінаваны; праверкі ведаў, уменняў і навыкаў (кантролю). Як самастойныя тыпы ўрокаў разглядаюцца ўрокі развіцця маўлення (навучання пераказам, сачыненням) і ўрок аналізу пісьмовых работ (карэкцыі ведаў, уменняў і навыкаў).

Урок складаецца з пэўных **структурных элементаў**: арганізацыйнага моманту (арганізацыйнага пачатку ўрока), праверкі дамашняга задання, актуалізацыі апорных ведаў, тлумачэння новага матэрыялу (увядзення новага матэрыялу), фарміравання ўменняў і навыкаў, падвядзення вынікаў урока, інфармацыі пра дамашняе заданне. Кожны элемент выконвае ўласцівую яму функцыю. Пры гэтым адны структурныя часткі прысутнічаюць на любым уроку, іншыя – толькі на ўроку пэўнага тыпу.

*Арганізацыйны пачатак урока* прадугледжвае папярэднюю арганізацыю класа (праверка падрыхтаванасці вучняў да працы, канцэнтрацыя іх увагі, выяўленне адсутных), стварэнне на ўроку рабочай атмасферы.

У час *праверкі дамашняга задання* неабходна высветліць правільнасць, паўнату і ўсвядомленасць выканання яго вучнямі, выявіць прабелы ў іх ведах і ўменнях. Выбар спосабаў праверкі ў асноўным залежыць ад таго, якім было дамашняе заданне: вусным ці пісьмовым, рэпрадуктыўным ці творчым. Для праверкі пісьмовага задання рэпрадуктыўнага характару выкарыстоўваюцца поўная праверка; выбарачная праверка (вучні знаходзяць у практыкаванні моўныя з'явы ў адпаведнасці з пастаўленай настаўнікам задачай); самаправерка (вучні параўноўваюць выкананае практыкаванне з узорам, які запісаны на дошцы ці спраецыраваны на экран); выкананне работы, якая аналагічная дамашняй; дыктант на матэрыяле дамашняй работы і інш. Узровень засваення тэарэтычнага матэрыялу можна праверыць з дапамогай розных відаў апытвання: індывідуальнага, франтальнага, ушчыльненага (камбінаванага).

*Актуалізацыя апорных ведаў* уяўляе сабой мэтанакіраванае паўтарэнне раней пройдзенага матэрыялу і ўзнаўленне тых ведаў і уменняў, без якіх зразумець новую тэму немагчыма.

*Тлумачэнне новага матэрыялу (увядзенне новага матэрыялу)* як найважнейшы структурны элемент урока прадугледжвае раскрыццё сутнасці моўнай з'явы і засваенне вучнямі ўзору выкарыстання атрыманых ведаў на

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

практыцы. Увядзенне новых ведаў адбываецца пры дапамозе розных метадаў: паведамлення настаўніка, гутаркі, назірання за моўнымі з’явамі і інш. Запамінанне вучнямі новых ведаў ажыццяўляецца ў працэсе чытання адпаведнага матэрыялу падручніка, адказу на пытанні настаўніка, засваення ўзору (алгарытму) выкарыстання атрыманых ведаў і інш.

На этапе *фарміравання ўменняў і навыкаў* адбываецца замацаванне тэарэтычных ведаў і авалоданне ўменнямі правільна прымяняць іх на практыцы. Для гэтага выкарыстоўваюцца розныя віды практыкаванняў (практычныя метады навучання). Іх выбар залежыць ад асаблівасцей вучэбнага матэрыялу, этапу яго засваення, узроўню падрыхтаванасці вучняў пэўнага класа і інш. Працу з навучальным практыкаваннем мэтазгодна ажыццяўляць у наступнай паслядоўнасці: паведамленне мэты выканання практыкавання, вызначэнне спосабу яго выканання, аналіз (пры неабходнасці) узору выканання, выкананне практыкавання і яго праверка.

*Падвядзенне вынікаў урока* прадугледжвае сістэматызацыю атрыманых вучнямі ведаў і ацэнку настаўнікам працы вучняў на ўроку. Для сістэматызацыі атрыманых ведаў можна выкарыстоўваць вуснае апытванне, а таксама наступныя заданні: запоўніць табліцу прыкладамі, якія адлюстроўваюць сутнасць моўнай з’явы; адлюстраваць тэарэтычны матэрыял з дапамогай схемы; пералічыць умовы, пры якіх дзейнічае тая ці іншая моўная норма, і інш.

*Інфармацыя пра дамашняе заданне* як кампанент урока ўключае запіс дамашняга задання на дошцы і ў дзённіках вучняў, а таксама (пры неабходнасці) інструктаж па яго выкананні. Пры выбары дамашняга задання неабходна пазбягаць перагрузкі школьнікаў, улічваць іх вучэбныя магчымасці, прадугледжваць заданні рознай ступені складанасці і інш.

Прыкладнае размеркаванне вучэбнага часу на структурныя элементы ўрока можа быць наступным: на праверку дамашняга задання – 8–10 хвілін, на тлумачэнне новага матэрыялу – да 15 хвілін, на фарміраванне ўменняў і навыкаў – 15 хвілін, на астатнія структурныя элементы – 5–7 хвілін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Тыпы і структура ўрокаў беларускай мовы

**Урок вывучэння новага матэрыялу (увядзення новых ведаў)** прызначаны для азнаямлення школьнікаў з новай моўнай з’явай і фарміравання першасных уменняў. Урок гэтага тыпу мае наступныя структурныя кампаненты:

– арганізацыйны пачатак урока;
– паведамленне тэмы ўрока, пастаноўка мэт заняткаў;
– актуалізацыя апорных ведаў;
– тлумачэнне новага матэрыялу (увядзенне новых ведаў);
– замацаванне ведаў, фарміраванне першасных ўменняў і навыкаў;
– падвядзенне вынікаў урока;
– інфармацыя пра дамашняе заданне.

Праверка дамашняга задання на ўроку вывучэння новага матэрыялу, як правіла, не праводзіцца. Але яна можа прысутнічаць, калі ў час праверкі будзе адбывацца актуалізацыя тых ведаў, якія спатрэбяцца для засваення новай тэмы.

**Урок замацавання ведаў, удасканалення ўменняў і навыкаў** праводзіцца адразу пасля ўрока вывучэння новага матэрыялу. Асноўнай яго мэтай з'яўляецца ўзнаўленне і замацаванне ведаў, атрыманых на папярэднім уроку, і ўдасканаленне ўменняў і навыкаў вучняў. Тыповая структура гэтага ўрока наступная:

– арганізацыйны пачатак урока;
– паведамленне тэмы ўрока, пастаноўка мэт заняткаў;
– праверка дамашняга задання;
– замацаванне ведаў, удасканаленне ўменняў і навыкаў;
– падвядзенне вынікаў урока;
– інфармацыя пра дамашняе заданне.

Калі ў час праверкі дамашняга задання будзе ўстаноўлена, што тэарэтычны матэрыял папярэдняга ўрока асэнсаваны вучнямі недастаткова глыбока, неабходна будзе вярнуцца да яго і растлумачыць яшчэ раз.

**Урок паўтарэння і сістэматызацыі вывучанага** ў асноўным праводзіцца ў канцы вывучэння пэўнай вялікай тэмы ці раздзела з мэтаю абагульнення і сістэматызацыі ведаў вучняў. Звычайна на ўроку гэтага тыпу прысутнічаюць наступныя структурныя элементы:

– арганізацыйны пачатак урока;
– паведамленне тэмы ўрока, пастаноўка мэт заняткаў;
– праверка дамашняга задання;
– узнаўленне ведаў па тым матэрыяле, які паўтараецца і сістэматызуецца (напрыклад, узнаўленне ведаў па раздзеле "Лексіка. Фразеалогія");
– паглыбленая праца над тэарэтычнымі ведамі і практычнымі ўменнямі;
– кантроль узроўню ведаў, уменняў і навыкаў вучняў;
– падвядзенне вынікаў урока;
– інфармацыя пра дамашняе заданне.

На **камбінаваным уроку** адбываюцца засваенне вучнямі невялікіх па аб'ёме новых ведаў і выпрацоўка адпаведных уменняў і навыкаў. Тыповая структура камбінаванага ўрока мае наступны выгляд:

– арганізацыйны пачатак урока;
– паведамленне тэмы ўрока, пастаноўка мэт заняткаў;
– праверка дамашняга задання (часта з адначасовай актуалізацыяй апорных ведаў);
– тлумачэнне новага матэрыялу;
– першаснае замацаванне набытых ведаў;
– фарміраванне ўменняў і навыкаў;
– падвядзенне вынікаў урока;
– інфармацыя пра дамашняе заданне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Урокі кантролю (праверкі ведаў, уменняў і навыкаў)** дазваляюць настаўніку высветліць узровень засваення вучнямі пройдзенага матэрыялу, убачыць, на якія пытанні яшчэ неабходна звярнуць увагу, якія ўменні і навыкі патрабуюць далейшага ўдасканалення. Праверка арфаграфічнай і пунктуацыйнай пісьменнасці школьнікаў адбываецца звычайна з дапамогай кантрольнага дыктанта. Праверыць не толькі ўзровень засваення арфаграфічных і пунктуацыйных нормаў, але і сфарміраванасць камунікатыўных уменняў дазваляюць кантрольныя творчыя працы (пераказы, сачыненні). Сфарміраванасць вучэбна-моўных, маўленчых, арфаграфічных і пунктуацыйных уменняў і навыкаў можна праверыць з дапамогай кантрольных тэстаў.

**Урокі развіцця маўлення** накіраваныя ў першую чаргу на фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі школьнікаў. Праца, што праводзіцца на такіх уроках, станоўча ўплывае на ўзбагачэнне слоўніка і развіццё граматычнага ладу маўлення вучняў, авалоданне імі нормамі беларускай літаратурнай мовы. У якасці асноўнай дыдактычнай адзінкі на ўроках развіцця маўлення звычайна выступае тэкст пэўнага тыпу і стылю.

З мэтаю развіцця звязнага маўлення ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі найчасцей выкарыстоўваюцца пераказы, сачыненні, пераклады.

**Урок аналізу пісьмовых работ (карэкцыі ведаў, уменняў і навыкаў)** праводзіцца пасля кантрольных дыктантаў, пераказаў, сачыненняў, тэстаў. Яго асноўная мэта – ліквідаваць прабелы ў ведах і уменнях школьнікаў. Рыхтуючыся да такога ўрока, настаўнік вызначае памылкі, якія найчасцей дапускалі вучні, прадумвае прыёмы іх тлумачэння, падбірае неабходны дыдактычны матэрыял для карэкцыі адпаведных уменняў і навыкаў.

Структура ўрока аналізу пісьмовых прац звычайна наступная:

– арганізацыйны пачатак ўрока;

– паведамленне настаўніка пра вынікі напісання работы;

– калектыўнае выпраўленне тыповых памылак;

– выкананне практыкаванняў на тыя правілы, на якія былі дапушчаны тыповыя памылкі;

– выпраўленне індывідуальных памылак;

– інфармацыя пра дамашняе заданне.

*У. П. Саўко*

*Саўко, У. П. Урок беларускай мовы / У. П. Саўко // Энцыклапедыя для школьнікаў і студэнтаў. У 12 т. Т. 7 Беларуская мова. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2017. – С. 331–333.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ